# АЛЕСЬ ВЕШТОРТ



## Піяніна пад дахам

Апавяданне з рамачнай кампазіцыяй

Вешторт Алесь нарадзіўся 11 ліпеня 1994 года ў Мінску. Скончыў факультэт інфармацыйных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, магістр тэхнічных навук. Працуе вядучым спецыялістам у сферы інфармацыйнай бяспекі. Жыве ў Мінску.

Дрэвы расступіліся, на даляглядзе з'явіўся разбіты ланцужок аранжавых ліхтароў. Кіроўца паменшыў хуткасць і выключыў фары. Машына збочыла на гравійку, прапаўзла крыху па гразкіх калдобінах і, цяжка рыпаючы зламаным кустоўем, убілася ў хмызняк.

Ён зашпіліў дажджавік, напнуў на галаву ліхтарык, выцягнуў з багажніка заплечнік і дробнымі, асцярожнымі крокамі затупаў уздоўж узбочыны, стараючыся не запэцкаць у ямах-лужынах светлыя замшавыя красоўкі з каралава-ружовымі шнуркамі.

Буйныя кроплі барабанілі па капюшоне, шамацела сінтэтыка, усе навакольныя гукі губляліся ў гэтым шолаху. Час ад часу ён спыняўся, нязграбна замiраў на месцы і доўга ўглядаўся ў цемру дажджу.

Стары ключ крануўся замка, бразнуў аб плітку, некалькі разоў ухіліўся ад рукі, якая шукала яго ў змакрэлай траве, але, у рэшце рэшт, улез у замочную адтуліну.

Чалавек прыўзняў дзверы — і яны тут жа расчыніліся пад напорыстым ветрам. Ліхтарык заміргаў і пацьмянеў.

Яно звісала са столі. Чорнае, масіўнае, нерухомае.

Ён разгарнуў заплечнік, намацаў пакрыты гумай дзяржак і нанёс удар.

* * *

«Тук-тук-тук»,— пастукаў нехта. І зноў: «Тук-тук-тук». Мерна і рытмічна. Затым «бах-бах-бах» з такімі ж дакладнымі паўзамі, але больш настойліва.

«Бах-бах... ЛЯСЬ!» — Антон ускочыў на ногі і зачыніў акно. На суседняй вуліцы будавалі метро.

Дзіна перакруцілася пад коўдрай, паказала круглявы вохрысты плячук, нешта прашаптала і зноў правалілася ў сон.

# ІРЫНА МАКАРЧУК



## А мы, напэўна, скрозь усе Маргарыты...

Вершы

Макарчук Ірына нарадзілася 19 кастрычніка 2004 года ў аграгарадку Лінова Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Студэнтка другога курса філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Друкавалася ў бярозаўскай раённай газеце «Маяк», часопісах «Полымя» і «Маладосць», а таксама ў альманаху «Першацвет».

✦ ✦ ✦

Не хочацца пісаць калі
Ды паміраюць думкі,
Бяру я сілу ад зямлі,
Сціраю гора гумкай.

Бяру я спевы ад зарніц,
Абдымкі — ад туманаў.
Бяру я водары суніц
І словы ад каханых.

Бяру я ціхі шэпт дамоў
І фарбы ад світанкаў,
Бяру гісторыі муроў
І засынаю ранкам.

Бяру я песню салаўя
Ды воблачную вату,
На ніткі нанізаю я
Усе сузор'і, даты.

Не хочацца пісаць калі
Ды паміраюць думкі,
Бяру я сілу ад зямлі,
Сціраю гора гумкай.

✦ ✦ ✦

Калі знікаюць думкі
У галаве застаюцца
Званы пустаты
І мы ідзём
Схаваныя
Ад людзей
І ад саміх
Сябе
Нашыя рукі
Трымаюць атруту
На кончыках пальцаў
І падліваюць яе
У нашую каву
Пакуль мы

# АРЫНА ПРАНІКАВА

## Апавяданні



Пранікава Арына нарадзілася 5 ліпеня 2001 года ў Наваполацку Віцебскай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «літаратурная работа (творчасць)», зараз вучыцца ў магістратуры. Журналісцкі дэбют адбыўся ў раённай газеце «Полацкі веснік». Літаратурныя творы друкаваліся ў часопісе «Маладосць» і альманаху «аБДУмана». Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы — у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «На экранах». Лаўрэат міжнароднага літаратурнага конкурсу «Першацвет».

### Закон парадку — закон хаосу

Святло залівала галоўную залу Нябеснага палаца. Пуста і ціха, рэдкія госці ўжо разышліся. Час такі — зіма.

І таму пакуль трон займаў Бог Каменю. На ўвесь пантэон ён вядомы як самы строгі, разважлівы, справядлівы і халодны, нібы падземны палац Багіні Смерці, куды ён адпраўляўся, як толькі з Поўдня павее першым цяплом. Ён больш за ўсё цаніў спакой і раўнавагу. І не любіў, калі іх парушаюць. Нават міжволі.

Дзверы адчыніліся, імклівы парыў уварваўся ў памяшканне, прынёс за сабою ледзь улоўны пах вясны. Бог Каменю нават не здрыгануўся. Толькі адна істота ва ўсіх светах, бачных і не, магла так бесцырымонна ўварвацца да дзейнага Кіраўніка Нябёсаў.

Бог Вятроў. Той, хто хутка яго зменіць.

— Як жа ў цябе тут сумна,— прама з парога заявіў госць. Ён ніколі не адрозніваўся тактоўнасцю і ігнараваў усе правілы прыстойнасці. Магчыма, мог так рабіць адмыслова, ведаючы, што гэта вельмі раздражняе.

— Лепш, каб цэнтр Нябёсаў ператварыўся ў дом ганебных задавальненняў? — адказаў пытаннем Бог Каменю, усё ж павярнуўшыся да наведвальніка.

— Менавіта за гэта мяне і любяць! — усміхнуўся Бог Вятроў, праігнараваўшы выпад. Такая дробязь не магла яго пакрыўдзіць.

Бог Вятроў адным сваім існаваннем разбураў усё упарадкаванае, не прыкладаючы ніякіх намаганняў. Ён мог з'явіцца ў самы нечаканы момант і ўсё перавярнуць дагары нагамі. Перацягнуць увагу на сябе. Сур'ёзнасць ператварыць у жарт, нуду — у свята. Ён хітрыў, плёў інтрыгі найлепш за самаўлюбёную Багіню Прыгажосці. Казаў

што думаў, балбатаў не змаўкаючы. Мог стаць цёплым ветрыкам, а мог — магутным віхрам, які руйнуе цэлыя гарады.

Яму дастаткова проста быць.

І ўсё ж такі Бог Каменю часам сур'ёзна задумваўся, навошта такая некіравальная, легкадумная сіла патрэбна Стваральніку. Столькі бед перажылі Нябёсы менавіта з-за нораву Бога Вятроў. Ён, як дзіця, не разумее, калі гульню трэба спыніць.

— Яшчэ рана,— сказаў Бог Каменю.

— Усяго толькі захацеў наведаць старога сябра. Табе шкада, ці што?

Бог Вятроў выглядаў лагодна, як і заўсёды, але верыць яму — сябе не паважаць. Так думаў Кіраўнік Нябёсаў. Добраахвотна пакінуць цёплую старану? Не падобна нават для гэтага дзівака. Але наўрад ці Бог Каменю мог сцвярджаць, што добра яго ведае.

Госць рухаўся так лёгка, быццам лунаў, і дэманстратыўна аглядаў залу. Мімаходзь аддзяліў некалькі сцяблін пахкай травы з вянка і кінуў у агонь. Зусім няшмат, каб казытала нос, але не туманіла галавы. Бог Каменю ўжо не мог хаваць незадаволенасць за маскай абыякавасці: што за самадзейнасць? Хай і нязначная, але ён усё яшчэ тут гаспадар.

За мітуснёй дзеючы Кіраўнік Нябёсаў прапусціў момант, калі Бог Вятроў апынуўся зусім блізка, побач, выхапіў проста з яго рук келіх і адпіў трохі віна — з павагаю да асабістых межаў ён таксама не знаўся.

— Як ты гэта п'еш? — зморшчыўся ён.— Фарбаваная вада!

— У добрага кіраўніка заўсёды павінна быць чыстая галава.

— О, не сумняваюся,— Бог Вятроў засмяяўся так адкрыта, быццам пачуў самы смешны жарт.

Чамусьці, нягледзячы на ўсе спробы падчапіць госця, менавіта Бог Каменю адчуваў сябе абражаным.

— І ўсё ж такі, што табе трэба?

— Я ж сказаў: наведаць старога сябра.

Бог Каменю ўздыхнуў, стомлена пацёр пераноссе і апусціўся на пазалочаны трон — законнае месца, якое напаўняла ўпэўненасцю. Ён здаўся. Гэта легкадумнае (у прамым сэнсе ветранае) стварэнне было невыносным.

Збоку нібы ўскалыхнуў прастору лёгкі віхор. Бог Вятроў гарэзна падсеў на падлакотнік трона і ледзь нагамі не матляў. Лёгкі дотык да пляча — зачапіў пер'ем з абруча на галаве. Бог Каменю памятаў, як сам Стваральнік надзеў гэтую крылатую карону на непрызнанага паўкроўку, якому цяпер дазволена займаць кіруючае месца на Нябёсах кожную вясну. І як потым яе ж шукалі па ўсім свеце, таму што *хтосьці* згубіў, моцна напіўшыся.

— Ведаеш,— голас Бога Вятроў быў па-хлапечы звонкі і адскокваў ад сцен, як шкляныя пацеркі,— мяне сапраўды клапоцяць нашы адносіны. Не, праўда, ты бачыў свой твар? Гэта ж жах! Ад аднаго погляду моташна! Кожны раз, калі займаю гэтае месца,— ён паляпаў побач па булавешцы ў выглядзе бутона кветкі,— здаецца, быццам адабраў сілком.

Бог Каменю адчуў, як унутры ўспенілася злосць. Нягледзячы на вонкавую непахіснасць, дзеючага Кіраўніка Нябёсаў можна было параўнаць з драмлівым вулканам, які аднойчы можа прачнуцца і стрэліць снапамі іскраў і выкідамі попелу.

— Я сапраўды настолькі табе не падабаюся? — паставіў пытанне рубам Бог Вятроў.

Бог Каменю замёр, нібы ад аплявухі. Ён назіраў, як з павабнага твару «сябра», з такімі мяккімі рысамі, раптам знікла бесклапотнасць, вочы пацямнелі, як мора перад навальніцай. Быццам перад ім нарэшце паўстала моцнае боства, такое ж старажытнае, хоць і крыху маладзейшае. Здаецца, сам забыўся ўжо, што менавіта гэты бестурботны жартаўнік некалі здолеў вярнуцца з Пустэчы, дзе ўсе або самі знікалі навечна, або канчаткова гублялі розум. Лёгкае вар'яцтва Бог Вятроў прынёс не адтуль, клёку ў галаве ён не меў заўсёды. Але няўлоўна нешта змянілася. Бог Каменю часам заўважаў у яго шкляны, амаль мёртвы погляд, які тут жа змяняўся на звыклы радасны.

Дык, мабыць, менавіта гэта не падабалася — зменлівасць і няпэўнасць, а не сам Бог Вятроў.

# АЛЯКСАНДРА ЖАЛЯЗНОВА



## Голас сэрца

Вершы

Жалязнова Аляксандра нарадзілася 7 ліпеня 1999 года ў Гомелі. Скончыла факультэт міжкультурных камунікацый Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Друкавалася ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Лаўрэат міжнароднага літаратурнага конкурсу «Першацвет». Жыве ў Мінску.

### Табе

Мой прамень сярод хмараў і цёмных лясоў,
Мой глыток недапітай гарбаты.
Дзіўны водар густых васільковых палёў,
Родных ніў і драўлянае хаты.

Мая зорка на небе і кропля вады
У вялікім раз'юшаным моры.
Мая памяць і першыя крокі, сляды,
Залатыя далёкія горы.

Мая сіняя птушка, мой талісман,
Мая вера, любоў і надзея.
Ад дэпрэсіі лекі, ад жудасных ран —
Мая радасная падзея.

Мае вобразы маюць аднолькавы сэнс,
Я цябе сярод іх уяўляю.
Захапляюся і ганаруся табой
І найлепшага толькі жадаю.

### За мной

*Рандо*

Аднойчы мне хопіць смеласці
Застацца нарэшце сабою.
Я стану тваёй супрацьлегласцю
З яскравай і творчай душою.
Я вартая толькі найлепшага,
Хай гэта убачаць людзі.
Ў жыцці я далёка не першая,
Але перамога будзе
Хутка за мной.

Не ў сілах змяніць я абставіны —
Насустрач адкрыюся ім,
Ствару свае ўласныя правілы.
Ўжо свет не здаецца чужым.
І — так, перамога стане
Хутка за мной.

# ВАЛЕРЫЯ ФІЦКЕВІЧ



## Гэй, вясна!

Вершы

Фіцкевіч Валерыя нарадзілася 29 верасня 2004 года ў горадзе Крупкі. Студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

### Ранак

я крычу
ку-ка-рэ-ку
я хачу
ра-нак веч-ны
я крычу
ад-ча-пі-ся
я хачу
зран-ку ў вы-сі
мая нуда
ка-ва
тое ёсць
ат-ру-та
ты ёсць
кам-лы-га
я ёсць
ра-пу-ха

* * *

думкам выказваем пратэст,
кажам «не» мы разважанням,
нам усім бы жорсткі рэст[1],
рэшты давяраем мантрам[2].

навокал нас крынжы[3], крашы[4],
з трэшам[5] чу наўздагон «ауф!»[6],
чылім[7], з кайфам ловім вайбы[8],
у інсту[9] заліваем пруф[10].

ззяе сонца нам адное,
нават мова ў нас адна,
на жаль, слэнгу ўсё рабое,
але ж быць розніцы — ведайма.

Фота з архіва В. Фіцкевіч

---

[1] Адпачынак *(англ.)*.
[2] Меладычныя фразы аб імкненні чалавека да ісціны, святла, неўміручасці, ведаў і дзеянняў.
[3] Пачуццё сораму *(неал.)*.
[4] Чалавек, які вельмі падабаецца *(англ.)*.
[5] Адстой, смецце *(англ.)*.
[6] Файна, крута *(выкл.)*.
[7] Адпачываць *(англ.)*.
[8] Атмасфера, настрой *(англ.)*.
[9] Інстаграм.
[10] Пацвярджэнне, доказ *(англ.)*.

# ВАЛЯНЦІНА КАДЗЕТАВА

Апавяданні



Кадзетава-Арэстава Валянціна нарадзілася 17 красавіка 1951 года ў вёсцы Мікалаеўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыла Мінскі педагагічны інстытут імя Горкага (цяпер — Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка). Працавала настаўніцай. Друкавалася ў часопісах «Полымя», «Маладосць», «Нёман», газеце «ЛіМ». Аўтар кніг прозы «Ад кахання не паміраюць», «Ля трох пуцявін», «Шкляная зорка», «Варыяцыі на вечную тэму», «Лякарства ад стомы». Дыпламант і лаўрэат рэспубліканскіх літаратурных прэмій, а таксама абласных прэмій імя Кірылы Тураўскага і Івана Мележа.

## Канцавая станцыя

Малюсенькі пакойчык пад самым дахам высачэзнага шматпавярховага дома. Ад пабеленых вапнаю сцен патыхае ўбоствам і безнадзейнасцю. За акном чорная і густая, як дзёгаць, цемень. Адчайна, з тужлівай мелодыяй б'ецца ў шыбы халодны беспрытульны вецер. Адзінота. Пранізлівая і бязвыхадная.

Што гэта? Забыты фрагмент рэальнасці? Даўні сон? Не ведаю. Але калі з глыбіні падсвядомасці выплывае гэтая няўцешлівая карціна, сэрца маё сціскаецца ад нядобрага прадчування і містычнага страху расплаты за ўсе грахі, «вольныя і міжвольныя». На жаль, мы не ўладныя над сваёй памяццю, і таму няма ў мяне ніякага шанцу пазбавіцца вусцішнага відовішча, якое звычайна папярэджвае мяне пра нягоду альбо перасцерагае ад чарговай жыццёвай памылкі. Ведаць бы своечасова і дакладна, пра якую нягоду папярэджвае і ад якой памылкі перасцерагае той ненавісны ці то фрагмент рэальнасці, ці то даўні сон! Але застаецца толькі спадзявацца на хісткасць прадчування ды мітусліва апраўдвацца за свае «грахі», якіх назбіралася нямала.

Некалі даўно, больш за тры стагоддзі таму, вядомы французскі пісьменнік-мараліст заўважыў: «Усе скардзяцца на сваю памяць, але ніхто не скардзіцца на свой розум». Дык вось я ў імкненні матываваць не вельмі гожыя ці проста легкадумныя свае ўчынкі скарджуся менавіта на ўласны розум. Скарджуся ўслых і, бывае, нават пры дапамозе ідыём сумніўнай мілагучнасці, але... толькі сам-насам з сабою. Калі б хто староннi пачуў маю скаргу і пагадзіўся са мною, я вельмі пакрыўдзілася б. Ды нармальны ў мяне розум! Проста ў пэўныя моманты ён здаецца ў палон маім жа эмоцыям. Пад іх уплывам я і нарабіла большасць сваіх жыццёвых памылак, адной з галоўных сярод якіх і быў мой колішні выбар.

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

## З неапублікаваных вершаў

### Вершы з аксамітнага альбома

Альбом захоўваецца ў хатнім архіве сям'і Краўцоў. Мае вокладку з чорнага аксаміту, і ў свой час Караткевіч даў яму назву «аксамітны альбом».

Тэксты друкуюцца паводле эракопіі «Альбома вершаў і празаічных твораў Караткевіча У. С., прысвечаных Валянціну Краўцу і яго сям'і» (аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі (далей — АРКіР), ф. 11, воп. 1, адз. зах. 278). Упершыню некаторыя аркушы аксамітнага альбома апублікаваны ў № 11 часопіса «Беларусь» за 1990 г.

У «аксамітны альбом» увайшлі малюнкі, вершы і ілюстраваныя гісторыі, напісаныя У. Караткевічам у пачатковы перыяд яго творчасці. Прыязджаючы ў Мінск з Оршы і Масквы, пісьменнік часта спыняўся на кватэры, а потым у хаце свайго аршанскага сябра Валянціна Краўца. Першы запіс датуецца днём заключэння шлюбу Валянцінам і Галінай Краўцамі (верш «Пожелание на свадьбу»; 1955 г.), апошні — 9 снежня 1962 г. (верш «Не верыш зіме за сваім акном...» з прысвячэннем «Галі і Вальку»).

*Кравец Валянцін Пілінавіч* (нар. 1932) — аршанец, сябар У. Караткевіча. Працаваў выкладчыкам у Беларускім політэхнічным інстытуце, кандыдат тэхнічных навук. *Кравец Галіна Максімаўна* (нар. 1934) — жонка В. Краўца.

У некаторых вершах з аксамітнага альбома сустракаюцца пэўныя недахопы, якія ўважлівы чытач здольны заўважыць, але яны паказваюць працэс творчага сталення маладога паэта, выяўляюць яго светапогляд, характарызуюць яго адметны стыль, адлюстроўваюць сяброўскія ўзаеміны.

### У кампаніі кітайскага тэрмаса

Сяджу ў ціхім пакоі адзін.
Вас сёння ў Мінску няма.
Гадзіннік прабіў адзінаццаць гадзін
І я пачынаю драмаць.
І ўсё ж такі спаць мне нельга пакуль,
Бо печку я запаліў.
(А Валька ж лайдак, лянівы, як куль,
Ніколі яе не тапіў!).
Стаіць на стале бутэлька «Хірса»,
Карушка ў масле стаіць.
Але ж я не магу, як нейкі басяк,
Сесці сам і гарэлку піць.
Я адзін. Толькі тэрмас чырвонай гарой
На стале стаіць ля сцяны:
«Вып'ем, браце, на брудэршафт з табой.
Мы сягоння з табой адны».
Згасне ў печы апошні водбліск агня,
Як апошні брыкет дагарыць,
Адкручу яму крышку, налью віна:
«Пі, браток. Далёка сябры».

*18 красавіка 1957 г.*
*11 гадзін ночы. Адзін.*
*Палю грубку*

### Да гадавіны сустрэчы

Не чакалі мяне, напіліся.
Як паны, пайшлі ў «Беларусь».
Паплятуся адзін да Смілавіч,
Да зялёнага змія дап'юсь.

Я ж цягнуў да вас коўдру з варэннем,
Пот з чала майго ўніз спадаў,
Я змарнеў, стаў празрыстаю ценню,
Ад напругі грыжу прыдбаў.

Для такога дня урачыстага
Паўлітэрку ў кішэні цягнуў.
Каб вас заўтра ўзялі нячысцікі
І яшчэ антылопы — гну!!!

ІНТЭРВ'Ю

# АЛЕСЬ НІКАНЕНКА

## Як убачыць чалавека: выкрыццё фанацтва



Ёсць такі тып людзей, якім падабаецца быць залежнымі. Я кажу не пра банальнасць накшталт алкаголю або цыгарэт. Не, гэта ўсё даўно ператварылася ў пошласць і штодзённасць — нецікавую і сумную. Ёсць людзі, якім падабаецца залежнасць ад эндарфінаў/дафаміну/аксітацыну. Ад любой з тых шматлікіх рэакцый, якія ўзнікаюць у чалавечым арганізме, калі яму нешта падабаецца. Адна з такіх залежнасцей — фанацтва. Я з такіх, з фанатак. Яшчэ ў дзяцінстве, калі мне было пяць, пачала фанацець па дыснэеўскіх мульціках. Я перагледзела ўсе мультфільмы, я ўмольвала бацькоў купляць мне размалёўкі, кніжкі, цацкі, заплечнікі, пеналы і нават басаножкі з прынцэсамі! Потым з'явіліся новыя, больш дарослыя залежнасці. Кнігі, фільмы, музыканты, акцёры... Я ўступала ў фандомы лёгка, а выходзіла з залежнасцей цяжка, пастаянна да іх вяртаючыся. На першым курсе ўніверсітэта раптам аказалася, што мая залежнасць не абавязкова толькі ў экране ноўтбука. Не абавязкова толькі на застаўцы тэлефона. Не, вось жа яна, жывая і дыхае на адлегласці метра. Маёй новай абсэсіяй стаў акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Алесь Ніканенка. І я раскажу вам пра тое, як гэта — быць фанаткай «жывога» чалавека.

### Як зараджаецца краш?

Усё пачалося з тэатра, а як інакш? Мяне яшчэ на першым курсе, пасля спектакля «А если завтра нет?» усё ў тым жа РТБД, захапіла магія, якая дзеецца ў канкрэтны момант, якую нельга паставіць на паскарэнне x2, як серыял або відэа на YouTube, і я паспрабавала звярнуць у сваю «веру» ўсіх вакол. У той злапомны вечар не пашанцавала сяброўцы Каці.

Мы трапілі на спектакль «Кар'ера доктара Рауса». Я, як звычайна, сядзела зачараваная дзеяй, а потым здарыўся цуд, які хтосьці больш дасведчаны ў медыцыне назваў бы якім-небудзь мудрагелістым тэрмінам. Я ж, пакідаючы за сабой права быць самой сабой, маладой і злёгку нахабнай дзяўчынкай, назаву гэта «лоўляй крашу». На сцэне з'явіўся біскуп. І ролю яго выконваў Саша Ніканенка. Тады яшчэ абсалютна незнаёмы мне чалавек.

Праз некаторы час я даведалася, што нарадзіўся ён у Дзень тэатра — 27 сакавіка.

— Лёс у мяне такі,— уздыхнуў з няшчырай скрухай, калі я захапілася падобным супадзеннем.

Але ў той момант я не ведала яго імя, не ведала, хто ён такі, нават амаль адхілілася ад таго, што адбываецца на сцэне. Я глядзела на тое, як ён грае — жыве, і чамусьці ў вачах у мяне стаялі слёзы.

Праз пяць гадоў Саша скажа мне, што не вельмі любіць, калі яго хваляць проста так.

# ДЗМІТРЫЙ ЦАЛКО

## Ваўкі і галубы

Кожны з нас чытаў кнігі для дзяцей, і, думаецца, не толькі ў дзяцінстве. Кнігі гэтыя, як правіла, напісаны ўжо дарослымі людзьмі. Але мала хто можа пахваліцца тым, што чытаў па-дзіцячы выказаны паэтычны зварот, накіраваны да дарослых. Выправіць гэты недагляд дапаможа кніга Яўгеніі Лязо «Пальба па галубах».

Яўгенія Лязо — гэта псеўданім Яўгеніі Касіловіч, студэнткі філалагічнага факультэта БДУ. Яе кніга была надрукавана ў 2023 годзе. У тым жа годзе адбылася прэзентацыя выдання ў літаратурным клубе «Вежа» на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Паэтычны зборнік «Пальба па галубах» напісаны верлібрам, складаецца з двух раздзелаў. Першы з іх уключае тры часткі («кнігі», як называе іх аўтар). Ён прысвечаны жыццю царкоўнаслужыцеляў, пераважна пратэстанцкім пастарам. У другі раздзел уваходзяць два невялікія апавяданні. Як і ў першым раздзеле, рухавіком сюжэту тут становіцца жыццё святароў, аднак калізія зрушана хутчэй у бытавы рэгістр. На мой погляд, аўтарская думка дадзенага зборніка атрымала сваё поўнае ўвасабленне ў «кнізе 1», таму спынюся на ёй больш падрабязна.

У цэнтры апавядання першай кнігі — сям'я Фогеляў (уласна, «кніга 1» і называецца «Фагеліяна»). Падзеі разгортваюцца, мяркуючы па ўсім, у 30-я даваенныя гады: гітлераўская Нямеччына рыхтуецца да вайны, збіраючы ў адзіным таталітарным парыве ўсе свае сілы і трэніруючы



Лязо, Я. Пальба па галубах / Яўгенія Лязо. — [б. м.] : Издательские решения, 2023. — 172 с.

паходны крок будучых салдат. Разам з бравурным бокам ідэалогіі яднання актыўна працуе і яе цёмны двайнік — рэпрэсіўны механізм, накіраваны на тых, хто з той ці іншай прычыны не згодны з палітычнай сістэмай. Паказаныя ў кнізе даносы, падвалы, турмы, катаванні, гільяціна — усё гэта атрыбуты таго няпростага часу. І менавіта ў гэтых гістарычных рэаліях змушаны несці сваю пастарскую місію Рудольф фон Фогель, пратэстанцкі святар. Выбраўшы ў якасці жыццёвай мэты шчырае служэнне Богу, ён, вядома ж, не можа прыняць злачынствы нацысцкага рэжыму, але і пакінуць Германію таксама не можа, паколькі вымушаны быць апорай для людзей, якія побач, — нягледзячы ні на што, выконваць свой хрысціянскі абавязак. У гэтым і заключана адна з галоўных ідэй зборніка: экзістэнцыйная праблема выбару паміж абавязкам і канфармізмам.